Сугучча

# БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ АДПРАВІЛІСЯ ВА УЗБЕКІСТАН

**Фонды Цэнтра народнай дыпламатыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ва Узбекістане папоўніліся беларускай літаратурай. Урачыстая цырымонія перадачы кніг адбылася ў межах святкавання 100-гадовага юбілею Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і рэалізацыі міжнароднага праекта «Беларусь сёння». У збор увайшло каля 100 найлепшых літаратурна-мастацкіх, навуковых, навукова-папулярных выданняў, а таксама энцыклапедыі, даведнікі і фотаальбомы нашай краіны. Узбекскаму чытачу калекцыя кніг прадставіць Беларусь ва ўсёй яе разнастайнасці: шматвяковая гісторыя, сучаснае жыццё, культурныя дасягненні і багатыя нацыянальныя традыцыі.**

Падчас мерапрыемства **Аксана КНІЖНІКАВА, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі,** распавяла, што ў 2010 годзе бібліятэка ініцыіравала стварэнне праекта «Беларусь сёння» — ідэя была падтрымана міністэрствамі культуры, інфармацыі і замежных спраў Рэспублікі Беларусь. За 12 гадоў існавання праекта камплекты кніг беларускіх аўтараў былі перададзены Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, нацыянальным бібліятэкам Азербайджана, Арменіі, Турцыі.

— Вядзецца супрацоўніцтва і з Узбекістанам. Мы шчыра спадзяёмся, што перададзеныя кнігі будуць запатрабаваныя, і з задавальненнем уручаем сертыфікат, — дадала Аксана Кніжнікава.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала зваротны падарунак ад Пасольства Рэспублікі Узбекістан. Фонды нашай галоўнай кніжнай скарбніцы папоўніліся калекцыяй з 24 плакатаў з выявамі дзеячаў культуры Узбекістана. Сярод іх — Абдула Арыпаў, Алішэр Наваі, Зульфія, Хамід Алімджан і іншыя. Таксама чытачам будзе даступны збор з 50 выданняў мастацкай прозы і паэзіі класікаў Узбекістана, якія раскрываюць нацыянальныя традыцыі, лад жыцця і быт узбекскага народа. Большасць кніг прадстаўлена на ўзбекскай мове.

Са словам выступіў саветнік Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматула Назараў:

— Вельмі прыемна атрымаць такі каштоўны падарунак для нашай краіны. Камплект кніг дазволіць нам бліжэй пазнаёміцца з беларускай культурай, а таксама даведацца аб вашай гісторыі. Я звярнуў увагу на тое, што і ў Беларусі, і ва Узбекістане людзі шмат чытаюць — гэта сведчыць аб тым, што кіраўнікі нашых краін звяртаюць пільную ўвагу на кнігавыдавецкую дзейнасць.



**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота дадзена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.**